УДК 821.161.3.0

І.Л. Шаўлякова-Барзенка, дац., канд. філал. навук
(Нацыянальны інстытут адукацыі)

# КАНЦЭПТАВАЯ ТАПАГРАФІЯ НАЙНОЎШАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Рэакцыяй на крызіс ідэнтычнасці (аксіялагічнай, эстэтычнай, мастацкай)сучаснай беларускай літаратурыў апошняй чвэрці XX ст. сталі працэсы яе мастацкай (сама)ідэнтыфікацыі. Наступствы гэтага на розных узроўнях мастацкай літаратуры як сістэмы выяўляюцца з рознай інтэнсіўнасцю. Так, плён структурных і зместавых трансфармацыйканцэптасферынацыянальнай літаратуры праз тры дзесяцігоддзі (з другой паловы 1980-х да сярэдзіны 2010-х гг.) акрэсліўся контурна.

Канцэптавая тапаграфіябеларускай літаратуры пачатку XXI ст.у спецыфічнай праекцыі аднаўляе своеасаблівую контурную карту нацыянальнай культуры як культуры “аўтэнтычнай” *беларушчыны.* Асноўным вектарам самаарганізаванайстратэгіі пераадолення згаданага крызісу ідэнтычнасці па меры руху ад канца XX ст. да другога дзесяцігоддзя XXI ст. становіцца рэміфалагізацыя *беларушчыны* як культуратворнага канцэпта нацыянальнага Міфа. Канцэптасферу літаратуры мы разглядаем як складанаарганізаваную сістэму, здольную да самаразвіцця; яе ўтварае рухомая іерархізаваная цэласнасць агульнанацыянальных, гісторыка-культурных і індывідуальна-аўтарскіх канцэптаў. Структураўтваральную ролю ў канцэптасферы найноўшай беларускай літаратуры выконваюць паняцці *‘памежжа’, ‘мова’, ‘скрыжаванне’, ‘вяртанне’, ‘тутэйшасць’, ‘чужынства’, ‘самота’, ‘псеўды’*і некаторыя іншыя. (Тэрміналагічная атрыбуцыягэтых паняццяў (культурны, філасофскі, мастацкі канцэпт; універсальны, індывідуальна-аўтарскі і г. д.) залежыць ад метадалогіі даследавання (мона- ці полідысцыплінарнай)). Трансфармацыі канцэптасферы абумоўліваюць не толькі вобразна-стылявую спецыфіку тэксту, але і вектар выхаду мастацкіх ідэй у сацыякультурны кантэкст.

У мастацкім свеце найноўшай літаратуры цесна пераплятаюцца катастрафізм светаадчування і спецыфічна-беларускі (ціха-ўпарты) аптымізм, узнёслая героіка і трагічная самота, экзістэнцыйная бязлітаснасць і шчымліва-пранізлівы экзістэнцыяльны лірызм. Паводле канцэптавай тапаграфіі найноўшай беларускай літаратуры можна, на наш погляд, скласці даволі поўнае ўяўленне пра спецыфіку, тэндэнцыі і найбольш верагодныя вектары развіцця канцэптасферы нацыянальнай культуры ў цэлым.